ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЯ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 107 (489) Субота 24 верасьня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню У АЎТОРАК, ЧАЦЬВЕР І СУБОТУ | ГОД ВЫД. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—4 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

Спэкулянты.

Скончыўся гандаль, які цягнуўся 4 месяцы. Ухан аб'яднаўся з Нанкіным, контр-рэволюцыйная кітайская буржуазія згрупавала свае шэрагі для сумеснай барацьбы супроць компартыі і ўсяго рабочага і сялянскага руху.

Як звычайна, здраднікі нацыянальнай рэволюцыі ўзмацнёна спэкулююць на імені Сун-Ят-Сэна і на яго популярнасьці сярод шырокіх пластоў кітайскага насельніцтва.

Праўда, яны прымушаны прызнаць, што, парваўшы з комуністымі і павярнуўшы супроць іх штыкі, яны парвалі з адным з заветаў Сун-Ят-Сэна, які настойваў на саюзе з компартыяй. Але яны стараюцца паказаць гэта, як частковасьць, якая не перашкодзіць ім цьвёрда ісьці за асноўнымі лініямі настаўніка.

Нікчэмны, дзяшовы выкрут!

Парваць з комуністымі—гэта значыць парваць з рабоча-сялянскімі масамі Кітаю. І ня дзіўна, што як ў Шанхаі і ў Нанкіне, так і ў Ухане разрыў сапраўдзіўся жорсткімі расправамі над працоўным насельніцтвам.

Але шматмільённыя масы кітайскіх рабочых і сялян прадстаўляюць сабою адзіную сілу, здольную заваяваць незалежнасьць Кітаю. Бо кітайская буржуазія сваімі ўласнымі сіламі ніколі ня зможа організаваць адпор бранірованаму кулаку чужаземных імпэрыялістых.

Гэта разумеў Сун-Ят-Сэн. Разумеюць і самі ўханска-нанкінскія політыканы, якія спрабуюць яго іменем прыкрыць сваю ганебную здраду.

У сваёй дэкларацыі, поўнай пагромных выпадаў супроць компартыі, яны ніводным словам не ўпамінаюць аб барацьбе супроць імпэрыялістых. Яны ўжо дайшлі да такой ступені падзеньня, што нават на словах не рашаюцца дабівацца таго, што складае выходны пункт і асноўную мэту нацыянальнай рэволюцыі.

І ўсё-ж гэтыя людзі рашаюцца выдаць сябе за барацьбітоў гэтай рэволюцыі. Каго яны думаюць абдурыць?

Нават ангельскі друк адкрыта прызнае, што ад новага ўраду ў Нанкіне можна чакаць поўнага спыненьня барацьбы супроць чужаземцаў. «Барацьбітоў нацыянальнай рэволюцыі» вітае воплескамі той асяродак, супроць якога гэтая рэволюцыя н кіравана.

Нацыянальная рэволюцыя прадаўжаецца, але паміма іх і супроць іх. Паход арміі Іе-Ціна на Кантон, дзе зараз пануюць іх аднадумцы, прадаўжаючы шырыцца і разьвівацца сялянскі рух, масавыя забастоўкі на японскіх і ангельскіх прадпрыемствах у Шанхаі і Ухане,—усё гэта сьведчыць аб тым, што лёс Кітаю будзе вырашаць ня кучка інтрыганаў і політычных спэкулянтаў, якія зараз „аб'ядналіся“ ў Нанкіне.

Гаспадарка Беларусі расьце.

Генэральная ідэя, якая праходзіць у кантрольных лічбах народнае гаспадаркі БССР, гэта разьвіцьцё вытворчых сіл гораду і вёскі і ажыцьцяўленьне лёзунгу аб індустрыялізацыі. Трэба тут абмовіцца, што мы разумеем пад «індустрыялізацыяй». Шмат таварышоў лічаць, што індустрыялізацыя азначае толькі вытварэньне сродкаў вытворчасьці. Такая думка няправільна. Вытварэньне сродкаў вытворчасьці ёсьць асноўная часьціна ў паняцьці „індустрыялізацыя“, але ня ўсё. Індустрыялізацыя азначае павышэньне ролі прамысловасьці ў краіне. Прычым роля прамысловасьці павінна перагнаць ролю сельскай гаспадаркі. Але кожны павінен ведаць, што разьвіцьцё прамысловасьці мае сваёй асноўнай мэтай павялічэньне здавальненьня насельніцтва. Дзеля гэтага неабходна сельска-гаспадарчая сыравіна. З гэтай прычыны будзе правільна, калі пад азначэньнем «індустрыялізацыя» разумеем таксама і разьвіцьцё сельскай гаспадаркі.

Савецкая Беларусь—краіна сельска-гаспадарчая. У 1926-27 годзе ўся агульная продукцыя падзяляецца такім чынам: 18 процантаў—прамысловасьці і 82 проценты—сельска-гаспадарчая продукцыя. Трэба адзначыць, што і гэтыя 18 процантаў прамысловай продукцыі Савецкая Беларусь дасягнула дзякуючы політыцы комуністычнай партыі, якая ў апошнія гады трымае курс на ўзмацненьне прамысловасьці.

У адносінах сельскай гаспадаркі кантрольныя лічбы вызначаюць узмацненьне яе інтэнсыфікацыі і далейшае павялічэньне пасяўных плошчаў. Адначасова ўзмацняецца курс на павялічэньне гадоўлі жывёлы.

Працэс, які адбываецца ў сельскай гаспадарцы да гэтага часу, дае наступны малюнак:

Агульны разьмер пасяўной плошчы ў бягучым 26-27 годзе павялічыўся на 2,3 проц., прычым зярновыя культуры засталіся стабільнымі (павялічэньне толькі на 0,6 проц., бульбяны клін павялічыўся на 4,8 проц. Што датычыцца пасяўных плошчаў пад ільном, дык яны павялічыліся на 11,6 проц.

Трэба адзначыць, што павялічэньне ў 26-27 г. пасяўных плошчаў пад ільном адбылося пасьля спаду ў мінулым годзе. Пасеў тэхнічных культур павялічыўся і дзякуючы пастанове Савету Працы і абароны аб павышэньні парыхтавальных цэн на тэхнічныя культуры, у прыватнасьці на лён.

З зярновых культур павялічыўся рост пасеву ячменю (на 11,5 проц.) і сеяных траў на 10 проц.

Гадоўля жывёлы павялічылася на 4,8 проц., прычым вызначаецца рост рабочай жывёлы і далейшае разьвіцьцё гадоўлі сьвіньняў.

Усё гэта пацьвярджае, што і ў адносінах разьвіцьця сельскай гаспадаркі адбываецца процэс рэканструкцыі.

У мэтах далейшага разьвіцьця сельскай гаспадаркі трэба ўзьмацніць яе рэорганізацыю. Кантрольныя лічбы на 1927-28 г. вызначаюць наступныя мерапрыемствы: павялічэньне работ па землеўпарадкаваньню і мэліорацыі, з аднаго боку, і ўзмацненьне машынізацыі і хімічнага ўгнаеньня, з другога боку.

Земляўпарадкаваньне вызначаецца павялічыць у будучым гаспадарчым годзе на 50 процантаў. Замест 440 тысяч гэктараў зямлі, якія ўпарадкавалі ў гэтым годзе, вызначана 660 тысяч гэктарад у 27-28 годзе. Працу па мэліорацыі думаюць організаваць такім чынам, каб эфэктыўнасьць яе была ўзмоцнена. На земляўпарадкаваньне і мэліорацыю вызначаюць ўкласьці каля 3 мільёнаў 500 тысяч рублёў.

Кантрольныя лічбы вызначаюць павялічэньне крэдытаваньня на хімічнае ўгнаеньне, чым можна будзе палепшыць апрацоўку пасеву і павялічыць ураджайнасьць.

Машынізацыя сельскае гаспадаркі Беларусі адбываецца ня так хутка, як мы хацелі-б. Гэта зразумела. Сельская гаспадарка на Беларусі нясе да гэтага часу ў большасьці экстэнсыўны характар (трохпольле). Трактары ёсьць толькі ў саўхозах і колектывах. У будучым годзе адначасова з павялічэньнем колькасьці трактароў вызначаецца, што вёска набывае каля 40000 плугоў і розных іншых машын.

Таварнасьць у беларускай сельскай гаспадарцы да гэтага часу вельмі нізкая і дасягае толькі каля 16 процантаў. Кантрольныя лічбы вызначаюць шэраг мерапрыемств, якія павінны павялічыць таварнасьць сельскай гаспадаркі і гэтым самым зрабіць больш рэнтабэльным вядзеньне сельскай гаспадаркі.

У адносінах хлеба БССР зьяўляецца спажывецкай краінай. Прычым вынікам таго, што сельская гаспадарка экстэнсыўна, многія сяляне прымушаны самі купляць хлеб. Добры ў гэтым годзе ўраджай дае магчымасьць паменшыць завоз у 27-28 годзе хлеб і павялічыць унутры БССР загатоўку збожжа да 3-4 міліёнаў пудоў.

Зразумела, што ва ўсёй сельска-гаспадарчай політыцы курс партыі накіраваны, побач з павялічэньнем вытворчых сіл у вёсцы, і на матар'яльнае палепшэньне бядняцкіх колаў у вёсцы. Дзеля гэтага будзе ўзмоцнена ўвага на разьвіцьцё машынных таварыстваў, прадстаўленьне розных ільгот, напраўленьне крэдыту ў бядняцкія гаспадаркі, а таксама на ўцягненьне ў прамысловасьць. Аб гэтым падрабязговей ў будучым артыкуле.

М. Баран.

Скарыстайце ўсе магчымасьці!

Такую пастанову выносіць мітынг чытачоў.

Шэраг устаноў даў мясцом паказаньні аб суботніку.

Трэба дабіцца, каб гэтыя паказаньні былі цалком выкананы.

Мае тры прапановы.

Прамова т. Маркевіча.

(Сэкратар Крычаўскага райкому ЛКСМБ).

Ужо ўнесьлі шмат прапаноў, кожны прамоўца даваў ўсё новае і новае...

Кароценька я скажу аб некалькі важных мерапрыемствах, якія трэба адзначыць да Кастрычніка ў вёсцы. Гэта—палепшыць і організаваць новыя **сельска-гаспадарчыя** гурткі, уцягнуць у іх усіх комсамольцаў—**самастойных гаспадароў**.

Другая прапанова таксама будзе аб гуртках, але іншых **вайсковых** і **санітарных**. Амаль у кожнай вёсцы знойдзецца дэмабілізаваны чырвонаармеец, якога можам выкарыстаць, як **кіраўніка** гэтымі гурткамі.

Трэцяе, аб **апалу**. Трэба, каб у суботнік хлопцы загатовілі апалу для школ.

Рыхтуемся.

Рэчыца. (Наш кор.). Атрымаўшы нумары «Комсамольскай Праўды» і „Чырвонай Зьмены“ аб мітынгу па правядзеньню суботніка, наша ф-ка „Днепр“ узялась за абгаварваньне.

Ячэйка прывядзе шэраг гутарак сярод дарослых і моладзі на тэму „Наш падарунак Кастрычніку“. Мы прывабім усю моладзь і партыйцаў да суботніка.

Апрача гэтага, усе ячэйкі Рэчыцы пачалі рыхтавацца да суботніка.

Штэйнбах.



Адзін з плякатаў, выданы да дзесяцігодзьдзя Кастрычніку.

Усім акруговым інспэкцыям камунальнай гаспадаркі.

У зьвязку з праводзімым ЦК ЛКСМБ комсамольскім суботнікам, які зьявіцца гаспадарчым падарункам да дзесятай гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі,—Вам неабходна будзе аказаць Акруговым Камітэтам ЛКСМБ усялякую дапамогу па практычнаму ажыцьцяўленьню гэтага суботніку шляхам:

а) організацыі патрэбных грамадзкіх прац; а) вылучэньнем на гэтую патрэбу неабходных сродкаў; в) уцягненьнем большай колькасьці моладзі ў гэтую працу.

Просьба наўперад паведаміць Камунальную інспэкцыю НКУС мяркуемы лік моладзі, якая будзе ўцягнута ў гэтую працу.

Намесьнік Старшага Інспэктара Камунальнай Гаспадаркі НКУС БССР НОВІКАЎ.

Сэкратар НКУС БЕРАЗІНСКІ.

Даем працу па камгасу—1000 ч.

Прамова т. Рубінштэйна.

(Інспэктар камунальнай гаспадаркі пры НКУС).

Організацыя суботніка для нас—ня новая рэч, кожны год мы становімся на чале гэткіх, напрыклад: у Дзень Лесу і інш.

Інспэктура Камгасу прапануе вам наступныя работы: па дрэванасаджэньню, акопцы, падсадцы і г. д.

Магчыма таксама і разьбіўка ў некаторых гарадох новых паркаў, ачыстка пляцовак ля фабрык і зьмена дрэваў на вуліцах.

Гэта ў горадзе.

Магу паведаміць, што грамадзкія работы дадуць вялікую карысьць, яны аплачваюцца прыблізна 2 р. ў дзень. Па ўсёй Беларусі мы займем звыш 1000 чал.

Зараз Інспэктура разаслала падрабязныя цыркуляры па акругам, якія вызначаць колькасьць патрабуемых рабочых.

Ну, аб работах на вёсцы, гаварыць на варта, папярэднія прамоўцы добра высьветлілі гэта становішча: пачынка цяжка прахадзімых мясцоў на шляхох, рамонт пажарных дэпо, пажарных абозаў і г. д. Работы будуць мець надзвычайна вялікае значэньне, бо дадуць новы штуршок сялянам, якія да пачынкі шляхоў адносяцца зусім кепска.

Уцягнем школьнікаў, дадзім ім карысную працу.

Прамова тав. Юшкевіча.

(Інспэктар народнай асьветы, Менскай акругі).

Таварышы!

Ніхто з выступаючых на мітынгу „Чырвонай Зьмены“ не закрануў пытаньня, што будуць рабіць нашыя школьнікі ў часе суботніку.

Мы ведаем нашу дзетвару, яны чула і шчыра адклікаюцца на кожнае мерапрыемства Савецкай улады, партыі або комсамолу.

Яны пільна сочаць за жыцьцём. Кожнае, хаця-б маленькае, даручэньне ўскладзенае на іх, якое мае сапраўдны, сур'ёзны сэнс, выконваецца з радасным уздымам і на рэдкасьць дакладна.

І ўявіце іх зараз, таварышы, нічога ня робячых, калі навокал будуць працаваць удзельнікі суботніку...

Наша задача — уцягнуць у суботнік школьнікаў.

Мы выпрацоўваем плян іх удзелу. А пакуль што я накідаў некалькі прапаноў.

— Школьнікі організоўваюць санітарнае абсьледваньне сваіх школ.

Аб значэньні гэтага абсьледваньня, нават ня прыходзіцца гаварыць, уявім толькі любую нашу школу, якую калі-небудзь бачылі...

— Школьнікі ў час суботніку сабіраюць ородкі сярод сялян на рамонт і пабудову новых школ.

— Разам з комсамолам старэйшыя хлапцы (у вёсцы) працуюць на рамонце дарог, абсталяваньні пляцовак і г. д.

Вось гэтыя папярэднія прапановы, дзякуючы якім мы ўцягнем нашых школьнікаў і піонэраў (асабліва ў вёсцы) у будаўніцтва нашай рэспублікі.

Прамова т. Валодзькі.

(Намесьнік Наркома Земляробства)

Калі мы хочам атрымаць сапраўды рэальную суму, то ні ў якім разе не павінны праводзіць суботнік у адзін дзень ці ў канцы кастрычніка.

Таварышы! Я гавару аб мэліорацыйных работах. На гэтых работах можа працаваць як, галоўным чынам, сялянская моладзь, так і гарадзкая.

МЭЛІОРАЦЫЙНЫЯ РАБОТЫ ДАДУЦЬ НАДЗВЫЧАЙНА РЭАЛЬНЫ ВЫНІК. ЗА КУБАСАЖАНЬ ВЫКІНУТАЙ НА БАЛОЦЕ ЗЯМЛІ МЫ ПЛОЦІМ 5 РУБЛЁЎ; ЗВЫЧАЙНА, КУБАСАЖАНЬ ЗЯМЛІ ВЫКІДВАЕЦЦА За ДЗЕНЬ.

Уявіце сабе, якую суму можа атрымаць суботнік, калі ва ўсіх акругах рэспублікі, на ўсіх мэліорацыйных работах нам удасца зрабіць суботнік.

Я стаўлю толькі адну умову: хутчэй узяцца за падрыхтоўку І ХУТЧЭЙ ЗА САМЫ СУБОТНІК, БО СЭЗОН МЭЛІОРАЦЫЙНЫХ РАБОТ, ЯК І САЎХОЗКІХ, ЗАРАЗ КАНЧАЕЦЦА. Трэба скарыстаць некалькі цёплых дзён, пакуль стаіць добрае надвор'е.

На мітынгу некаторыя таварышы гаварылі, што на лясных распрацоўках тасама зможа папрацаваць моладзь...

Я павінен папярэдзіць, што шляхам суботніка папрацаваць у ніякім выпадку нельга. На лясных распрацоўках павінна ўпартая праца разьлічана НА НЕКАЛЬКІ ДЗЁН.

Працкалектывы да суботніку.

Наркампрацы БССР даў загад акруговым аддзелам і кіраўніцтвам працкалектываў аб неабходнасьці самага актыўнага ўдзелу ў правядзеньні ўсебеларускага комсамольскага суботніку.

У працкалектывах суботнік павінен быць праведзены паміж 16-23 кастрычніка. Вылучаецца спэцыяльны дзень для суботніку.

У частцы працкалектываў на гэты час дапушчаецца звышурочная праца моладзі з такім разьлікам, каб некалькі дзён звышурочнай працы раўняліся аднаму рабочаму дню.

Усім Акрстатбюро.

У сярэдзіне кастрычніка бягучага году організацыі моладзі праводзяць масовыя суботнікі, якія зьяўляюцца гаспадарчымі падарункамі да 10-цігодзьдзя Кастрычнікава рэволюцыі. ЦСУ са свайго боку лічыць неабходным, каб мясцовыя Статбюро аказалі непасрэднае садзейнічаньне пачынаньню і выкарысталі суботнікі для работы.

Да агляду абуткавай фабрыкі.

Становішча вучнёуства у Бабруйске і ў дрэваапрацоўнікаў.

ФАБРЫКА, ЯК ЯНА ЁСЬЦЬ.

Рэдакцыя газэты «Чырвоная Зьмена» па ўдаламу прыкладу іншых газэт зараз пачынае праводзіць агляд менскай абуткавай фабрыкі.

Замест агульных артыкулаў аб значэньні рацыяналізацыі вытворчасьці, павялічэньні вытворчасьці працы, палапшэньні якасьці продукцыі, мы на працягу гэтага агляду канкрэтна вывучым гэтыя пытаньні на прыкладзе прадпрыемства і шырока абмяркуем, сумесна з рабочымі, як зьнішчыць недахопы.

Вопыт іншых газэт даў надзвычайна добрыя вынікі. Большасьць рабочых прымала актыўны ўдзел у аглядзе. Большасьць унесеных прапаноў ажыцьцяўлялася.

У бліжэйшыя дні прадстаўнікі рэдакцыі, сумесна з фабрычнай насьценнай газэтай, пачынаюць агляд Менскай абуткавай фабрыкі. Агляд працягнецца каля трох тыдняў.

Задачы агляду—вывучэньне, галоўным чынам становішча моладзі ў вытворчасьці і быта моладзі (як яна расходуе свой заработак, як адносіцца да сям'і, бацькоў, як праводзіць час пасьля фабрыкі).

Адначасова праз смотр будуць праходзіць і іншыя пытаньні жыцьця фабрыкі.

Агляд будзе адбывацца наступным парадкам. Ва ўсе часы агляду прадстаўнікі рэдакцыі дзяжураць на фабрыцы з 12 гадзін раніцы да 7 гадзін дню.

Усе прапановы ў вуснай і пісьмовай форме прымаюцца ў кожны час прадстаўнікамі рэдакцыі.

Удзельнічаць у аглядзе павінна ня толькі моладзь, але і ўсе рабочыя і работніцы. Толькі тады агляд дасьць патрэбныя вынікі.

Усе думкі і прапановы рабочых будуць асьвятляцца ў газэце і падлягаць шырокаму абгаварваньню.

Усё мэтазгоднае з іх будзе ажыцьцяўляцца.

Агляд павінен прыцягнуць усіх рабочых да абгаварваньня дасягненьняў і недахопаў фабрыкі, павінен садзейнічаць хутчэйшаму зьнішчэньню ўсіх хваробных зьявішч.

Шырокае асьвятленьне жыцьця фабрыкі пазнаёміць з абуткавай вытворчасьцю масы чытачоў «Чырвонай Зьмены», дасьць магчымасьць і другім скарыстаць вопыт абуткавай фабрыкі.

Рыхтуемся.

(На абуткавай фабрыцы)

На сходзе ячэйкі ЛКСМБ была зроблена інфармацыя аб аглядзе фабрыкі. У нядзелю гэтае пытаньне разглядала рэдкалегія насьценнай газэты. Вырашылі прысьвечыць агляду спэцыяльны нумар газэты, а ў выходзячым нумары зьмясьціць артыкул аб аглядзе і адозвы дырэктара і бюро ячэйкі ЛКСМ.

У панядзелак 19 верасьня агульны сход рабочых быў інфармаваны аб аглядзе.

Падрабязнай распрацоўкай каляндарнага пляну заняўся профактыў фабрыкі, які адбыўся ў аўторак. Амаль усе прысутныя выказалі свае думкі, як лепей правесьці тую вялікую працу, за якую ўзялася газэта.

Былі ўнесены прапановы ня спыняцца толькі на становішчы моладзі, але і на дасягненьнях і недахопах фабрыкі наогул, высьвятліць пытаньні і аб грамадзкай працы моладзі і шмат іншых.

Наогул актыў вельмі адобрывае агляд але непакоіцца, як бы што не перашкодзіла яго добра правесьці.

Абы з рук збыць.

— Тав. дырэктар! Зрабеце боскую міласьць, забярэце вы ад мяне гэтага гультая-вучня. Прыходзіцца з-за яго адрывацца на поўгадзіны кожны дзень і без усялякай компэнсацыі. Не жадаю яго вучыць і баста!

Такія размовы ад некаторых майстраў прыходзіцца часта **выслухоўваць дырэктару Бабруйскага чыгунна-мэталёвага заводу.**

Наагітаваўшы належным чынам дырэктара, майстар потым ідзе да вучня і «апрацоўвае» яго у сваю чаргу.

— Вось што, братка, адчапіся ты ад мяне і каціся сабе на дабру па здароўі. Я табе нават гатоў даплаціць, калі ты добраахвотна адмовішся ад навучаньня.

У чым справа? Чаму майстры адмаўляюцца ад свайго простага абавязку навучаньня «бранявікоў»?—На гэтыя пытаньні няма адказу.

Зразумела, што ўсё гэта разам узятае дрэнна адіваецца на пасьпяховасьці вучняў і шкодзіць ім у набыцьці кваліфікацыі.

Такому становішчу значна спрыяе погляд загадчыку заводу на бронь:—наш завод не дабрачынная ўстанова, каб дарэмна вучыць падросткаў на шкоду вытворчасьці,—кажа ён.

Калі на падрыхтоўку з броні кваліфікаванай рабочай сілы, наш «заў» будзе і далей глядзець як на дабрачыннасьць з свайго боку, дык з нашых вучняў сапраўды нічога талковага ня выйдзе.

Вучань.



Як вавёркі ў коле.
Аб „бранявіках“.

Яшчэ ў шмат якіх мясцох існуюць няправільныя і шкодныя погляды на бронь-вучнёўства.

Вось у нас, на дрэваапрацовачным заводзе майстры, пакладаючыся на вучняў, часта пакідаюць на іх работу, а самі самавольна адлучаюцца. Калі-ж выявіцца якая-небудзь неправільнасьць у выпрацоўваемым матар'яле, дык кажуць, што „вучань не даглядае: нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў“.

Акрамя таго, адсутнічае навучальная праграма, экспэртная камісія зьбіраецца не часьцей 1 разу ў 6-8 месяцаў.

А што заўком?—яму і гора мала, што вучні працуюць у ненармальных абставінах.

Такія адносіны дрэнна ўплываюць на бранявікоў: яны пачынаюць нядбайна адносіцца да інструмэнту, матар'ялу ды інш.

Адзначым яшчэ, што экспэртная камісія працуе не рэгулярна, вучні ня прымаюць ніякага ўдзелу ў вытворчых нарадах, апошнія ў сваю чаргу ніколі ня пацікавяцца, у якім становішчы знаходзяцца вучні і ці продукцыйна яны працуюць.

Я. Залуцкі.

Кавалак жывой працы.

Праводзім агляд піонэрскіх дасягненьняў.

„Вось дык піонэрчыкі“.

(Менск, Ляхаўка, піонэратрад № 21)

Дзякуючы зацікаўленасьці ячэйкі, наш атрад змог добра наладзіць сваю працу. Комсамольцы ня толькі заслухоўвалі справаздачы, але і дапамагалі нам у штодзённым жыцьці: наведвалі зборы, правадзілі гутаркі, сумесныя вечары і г. д.

Разам з бацькамі.

Да ў сей працы атраду мы заўсёды прыцягваем сваіх бацькоў. Мы склікалі сходы бацькоў па пытаньню ўдзелу іх у працы атраду, там яны далі нам шмат практычных паказаньняў у працы: па іх прапановах мы ўвялі вучотныя кніжкі, у якіх адзначалі пасьпяховасьць, наведваньне піонэрамі школ, трыманьне дома. Бацькі прынялі актыўны ўдзел пры шыцьці піонэрскіх гарнітураў: была створана спэцыяльная камісія, якая купляла матар'ял, здымала мерку і г. д. Сродкі для беднейшых дзяцей былі сабраны праз падпісны ліст, які мы пусьцілі і па ячэйцы і мясцкому. Бацькі наведвалі і збор савету атрадаў па чарзе. Па прапанове бацькоў, быў створаны гурток ручной працы. У гуртку займаліся і дзяўчаты і хлапцы, яны вышывалі, шылі, латалі старую бялізну, дапамагалі ў гэтым сваім маткам. Кіравала заняткамі дзяўчынка з профшколы краўцоў. Хоць гурток працаваў і ня доўга (тлумачыцца гэта няправільнай програмай: і старэйшыя, і малодшыя дзяўчынкі рабілі аднолькавую працу), але ў гэтым годзе мы яго зноў арганізуем.

У былой кірсе—застукалі малаткі.

Цікавіла піонэраў тэхнічная праца. Атрад па нядзелям стаў займацца ў сталярнай майстэрні, якая знаходзілася пры тэхнікуме. Захапіліся піонэры будоўляй, але адміністрацыя чамусьці забараніла работаць. Ніякія ўгаворы і просьбы ні да чаго не прывялі. Але мы і гэтую цяжкасьць перамаглі. Пайшлі у райбюро ЮП, там паднялі бузу. І, нарэшце, ў памяшканьні былой кірхі была створана сталярная майстэрня Ляхаўскага раёну. Цяпер нашы піонэры ведаюць, як абыходзіцца з інструмантамі, з варштатам.

Не хапала ў нас інструмантаў. А грошай—няма. Надумалі: абсьледуем, як абстаіць справа з інструмантамі ў піонэраў дома. Часта бывае так: ляжаць у піонэра дзе-небудзь у кутку ці малаток, ці абцугі, ці рубанак. А тут за кожную дробязь—грошы плаці. І вось спэцыяльная камісія здабыла такім чынам шмат інструмантаў.



Як піонэры уяўляюць Чэмбэрлена.

Піонэрскія кветкі.

Увесну абсталявалі вялікі кавалак садовай зямлі пры тэхнікуме. Зямля была разьмеркавана паміж зьвеньнямі. Кожнае зьвяно прыбрала свае градкі рознымі кветкамі, выклала на іх лёзунгі з кветак і дробнай цэглы, абклала дзёрнам. Тут былі і круглыя, і чатырохкутныя і ў выглядзе зорак, ромбаў, рознакалёрныя градкі. Саду было не пазнаць.

Чаму ў нас няма пераросткаў.

Гутаркі, якія мы праводзілі ў зьвеньнях, не марылі піонэраў. Мы правялі гутарку аб жыцьці ў старой арміі, аб грамадзянскай вайне, аб штодзённай гігіене піонэра (апошняя была праведзена шляхам апавяданьня). Праз гурток па падрыхтоўцы ў комсамол мы правялі шмат якіх піонэраў і, дзякуючы гэтаму, у нас у атрадзе няма пераросткаў—яны своечасова былі перададзены ў комсамол.

У казарму—з іголкай і ніткай.

Зьвяно «Чырвонаармеец» усю сваю штодзённую працу праводзіць у цеснай сувязі з сатаварыскай чырвонаармейскай ротай. Тут у іх і заняткі зьвяна, і гутаркі, і сьпевы, і гульні—разам. Праводзіліся заняткі нават так, што цікавілі і захаплялі самых чырвонаармейцаў. Піонэры вывучалі вінтоўку. Вучыліся страляць (у гадавіну Чырвонай арміі ўвесь атрад навучыўся страляць), разьбіраць і складваць вінтоўку.

Г. С.

Што робіцца на сьвеце?

Агляд апошніх міжнародных падзей.

Супярэчнасьці паміж кітайскімі здраднікамі.—Паўстанцкі рух пашыраецца.—Аграрнае пытаньне і пытаньне становішча рабочай клясы Кітаю зусім ня вырашана.—Нячуваны тэрор над кітайскімі працоўнымі масамі.—Нармальныя адносіны карысны як для Францыі, гэтак і для СССР.

Развал у лягэры кітайскіх здраднікаў.

Разьвіцьцё падзей у Кітаі ідзе па двух напрамках.

Расьце развал у лягэры здраднікаў рэволюцыі, у лягэры ўханска-нанкінскага ўраду. У той-жа час пашыраецца новы ўздым рэволюцыйнай хвалі, якая ідзе з кітайскага Поўдню.

Аб'яднаньне уханскага і нанкінскага ўрадаў не надае моцы здраднікам рэволюцыі.

Ужо ў сучасны момант, калі прайшло яшчэ усяго некалькі дзён пасьля іх афіцыйнага аб'яднаньня, паміж уханскімі і нанкінскімі палітычнымі дзеячамі, з аднаго боку, уханскімі і нанкінскімі генэраламі, з другога—пачалі існаваць некаторыя супярэчнасьці.

Палітычныя дзеячы, якія адбіваюць, галоўным чынам, інтарэсы буржуазіі, жадаюць узяць цалкам кіраваньне аб'яднаным урадам і паставіць у залежнасьць ад гэтага кіраўніцтва і дзейнасьць генэралаў.

Генэралы-ж, якія стаяць бліжэй да землеўласьнікаў, маюць сваёй мэтай узяць урад пад сваю «каманду».

Як бачыце, супярэчнасьць, з аб'яднаньнем уханцаў з нанкінцамі ня толькі ня зраўнавалася, але яшчэ больш наглыбляецца.

Акрамя таго, ідзе ўпартая барацьба і паміж асобнымі генэраламі.

Адны б'юцца за ўладаньне Шанхаем, за прыбытак шанхайскага порту, які зьяўляецца самым буйным у Кітаі.

Другія патаемна ўмаўляюцца з Чжан-Цзо-Лінам,—гэтым паўночным мілітарыстым, абяцаючы яму дапамогу ў барацьбе супроць Нанкіна і Ухана.

Трэція жадаюць быць самастойнымі ў тых раёнах Кітаю, дзе знаходзяцца іх арміі.

Моцны ўздым паўстанцкага руху ў Кітаі.

Развал у лягэры здраднікаў рэволюцыі робіць палягчэньне ў разьвіцьці сапраўдных рэволюцыйных сіл.

Паўстанцкі рух ахапіў ня толькі паўднёвую, але і значную частку сярэдняга Кітаю.

У правінцыі Хэнань (сярэдні Кітай) сялянскія партызанскія атрады перарэзалі чыгунку, якая ідзе з Ханькоу на Пекін.

На адной станцыі партызаны разброілі чыгуначных вартаўнікоў, узарвалі мост і перарвалі тэлефонную лінію.

Партызанскія атрады ўзброены кулямётамі. На сваім шляху яны захапляюць гарады, вядуць барацьбу з уханскімі і нанкінскімі войскамі.

Аднačасова невялікая рэволюцыйная армія, якая вышла са складу уханскай арміі, пры падтрыманьні сялянскіх атрадаў пасьпяхова ідзе да Кантону.

Горад Ханькоу з усіх бакоў абкружаны партызанскімі атрадамі.

У самым Ханькоу таксама не спакойна.

Улада баіцца комуністычнага выбуху.

Па гораду кожны дзень распаўсюджваюцца рэволюцыйныя праклямацыі.

У іх заклікаецца да ўсеагульнага паўстаньня супроць рэакцыйных генэралаў.

Сярод рабочых расьце забастовачны рух.

Чым усё гэта выклікаецца?

Асноўнай сілай ў кітайскім паўстанцкім руху зьяўляецца сялянства.

І гэта не дарма.

Зямельнае пытаньне зьяўляецца самым балючым у Кітаі. Вялізарная частка кітайскага насельніцтва мае зусім нязначную колькасьць зямлі. Тады як ёсьць землеўласьнікі, маючыя па некалькі тысяч дзесяцін.

І вось яны, уладаючы амаль на ўсёй зямельнай плошчай, надзвычайна эксплёатуюць беднае сялянства.

Гэта і дае, у сваю чаргу, моцны штуршок рэволюцыйнаму паўстанцкаму руху.

Ніводзін з урадаў, якіх у апошнія часы шмат разьвялося ў правінцыях Кітаю, ня здолеў вырашыць аграрнае пытаньне так, як вырашыць яго дамагаюцца сяляне.

Рабочае пытаньне таксама не вырашаецца ў духу патрабаваньняў, якія высоўваюцца рэволюцыйнай часткай кітайскага пролетарыяту.



Вось чые рукі працягнуты да Кітаю

Уханскі ўрад, яшчэ будучы рэволюцыйным, ня гледзячы на шэраг конкрэтных пропозыцый кітайскай компартыі па аграрным пытаньні, не адважыўся гэтыя пропозыцыі ажыцьцявіць.

А ўрэшце, пасьля разрыву з комуністымі, па прыкладу заўзятых кітайскіх мілітарыстых, узяўся за разгром узброеных атрадаў паўстаўшага сялянскага руху.

Толькі адна комуністычная партыя Кітаю высунула правільную праграму вырашэньня аграрнага пытаньня.

Таму пад яе ўплывам і кіраўніцтвам мы бачым гэткі магутны і вялізарны паўстанцкі рух, які распачаўся амаль ні ва ўсім Кітаі.

Бліжэйшая ваенная барацьба ў Кітаі будзе весьціся і вядзецца, галоўным чынам, у напрамку зьнішчэньня сялянскіх узброеных атрадаў.

Ужо і цяпер пачаўся вялізарны тэрор з боку ваеннай клікі Кітаю, накіраваны супроць рэволюцыйных рабочых і сялян.

Яўген Чэн аб белым тэрору ў Кітаі.

У гутарцы з прадстаўнікамі друку, ранейшы міністр замежных спраў уханскага ўраду Яўгэн Чэн, які зараз знаходзіцца ў Маскве, даў наступную характарыстыку існуючаму ў Кітаі тэрору.

— «З часоў рэволюцыі 1911 году,—сказаў Чэн,—кітайскі народ нясе вялізарныя ахвяры за сваё вызваленьне.

У сучасны момант тэрор абвастрыўся, дзякуючы паходу супроць комуністых і супроць усіх тых арганізацый сялянства, дзейнасьць якіх не падабаецца імпэрыялістым.

Зьверствы, якім падвяргаюцца кітайскія гарады і вёскі, робяцца, галоўным чынам, дэмаралізаванымі ваеннымі бандамі.

Становішча тых, хто пападае ў турмы—надзвычайна цяжкае.

Звычайна харч у турмах—рыс папалам з зямлёй. Існуючая ў Кітаі арганізацыя дапамогі афярам вызваленчага руху, ня гледзячы на яе папулярнасьць, ня можа здаволіць маючуюся патрэбу.

Без дапамогі з боку, усе тыя, хто знаходзяцца ў турмах, могуць загінуць з голаду.

Яшчэ раз аб нашых адносінах з Францыяй.

Пытаньне аб адносінах паміж Францыяй і СССР стаіць у цэнтры ўвагі.

Ужо досыць казалі аб тым, адкуль пачалася супроць савецкая кампанія ў Францыі. Чаму рэакцыйныя газэты хацелі разрыву з намі. Зараз, нават большасьць буржуазных газэт прызнае, што кампанія вялася на грошы ангельскіх арганізатараў барацьбы супроць СССР. Аднак, гэта спроба капіталістых, падняўшая шмат шуму—праваліласяа.

Пастанова савету міністраў Францыі ёсьць лепшым сьведкай таго, што ўся гэта кампанія была правакацыйнай, наскрозь хлусьлівай.

Чаму савет міністраў выказаўся супроць разрыву? Чаму большая частка французскай буржуазіі не жадае зараз разрыву з СССР? Яны-ж таксама ня любяць рабоча-сялянскай ўлады, як і ўся іншая буржуазія.

Справа ў тым, што добрыя адносіны паміж намі і Францыяй выгадны абодвым краінам.

Нам гэта выгадна таму, што гэта лішні раз **падцьвярджае нашу настойлівую політыку міру** з усімі дзяржавамі.

Мы да гэтага імкнемся таму, што гэта політыка вядзе да ўмацненьня экономічнай сувязі, выгаднай як нам, так і ўсім дзяржавам, якія жывуць з намі ў згодзе.

Па якіх жа прычынах Францыя зацікаўлена ў мірным сужыцьці з СССР?

Яна зацікаўлена ў гэтым таму, што добрыя адносіны з СССР паляпшаюць яе міжнароднае становішча.

Разрыў з намі прывёў бы да амаль поўнай залежнасьці французскай політыкі ад інтарэсаў Англіі.

А больш за ўсё справа ў тым, што Францыя экономічна зацікаўлена у добрых адносінах з Савецкім Саюзам.

Французская прамысловасьць мае зараз вялізную патрэбу ў рынках збыту сваіх тавараў. З гэтай прычыны Францыя зацікаўлена ў нашых заказах і ў гандлёвых з намі зносінах.

Гэтым і тлумачыцца тое, што правакацыйная кампанія за разрыў з СССР не знайшла зараз спачуваньня сярод большай часткі французскай буржуазіі і яе ўраду.

Але трэба сказаць, што рашэньне французскага ўраду не палажылаканец,—як трэба было чакаць,—траўлі СССР з боку больш рэакцыйных газэт.

Нам застаецца спадзявацца, што французскі ўрад утворыць лепшыя абставіны для перамоў, якія даўно пачаліся і якія даюць шэраг выгад як нам, так і Францыі.

Алёнін.

У ДНІ АСЕНЬНІЯ—РАДАСЬЦЬ ВЯСЕНЬНЯЯ

ПАДРЫХТУЕМ ДА ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЯ КАСТРЫЧНІКАВАЙ РЭВОЛЮЦЫІ ДОБРЫЯ ВЕЧАРЫ—СПЭКТАКЛІ!

МОЛАДЗЬ ГАЛАСУЕ ЗА ВЯЛІКУЮ ЎРАЧЫСТАСЬЦЬ, ЗА ЎЦЯГНЕНЬНЕ Ў ПРОЛЕТАРСКАЕ СЬВЯТА УСЯЕ МАСЫ СЯЛЯНСТВА

Для дзяцей наладзім ранішнікі з пачастункамі і падаркамі

За вялікую урачыстасьць!

Набліжаецца дзень 10-ай гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі, дзень калі усе працоўныя нашага Саюзу сумеюна з сваім правадыром—комуністычнай партыіяй, падвядуць вынікі сваёй працы за 10 год, вынік будаўніцтва соцыялізму ў нашай краіне.

Дзесяцігодзьдзе Кастрычнікавай рэволюцыі—гэта дзень праверкі нашых дасягненьняў і недахопаў ва ўсіх галінах будаўніцтва пролетарскай дзяржавы.

У горадзе будзе праходзіць сьвята пад знакам уздыму вытворчасьці, у вёсцы—пад знакам паляпшэньня сельскай гаспадаркі, паляпшэньня дабрабыту бядняцкай часткі сялянства.

Разам з гэтым, нашы хаты чытальні—як адзіныя культурныя цэнтры у вёсцы—са усімі сваімі гурткамі, павінны паказаць, як яны навучыліся задавальняць культурныя патрэбы насельніцтва.

Добра наладжаны хатай-чытальняй вечар у дзень дзесяцігодзьдзя Кастрычніку дасьць магчымасьць судзіць, як яна спраўляецца са сваімі задачамі у барацьбе за новы культурны быт.

Да Кастрычніку засталося яшчэ 6 тыдняў. Гэты час трэба поўнасьцю скарыстаць для падрыхтоўкі культурна-відовішчнай часткі сьята, каб гэтым самым гарантаваць вялікую, нябывалую урачыстасьць юбілея пролетарскай рэволюцыі

Дні вялікага сьвята.

Як ужо раней пісалася ў нашай газэце, асноўнымі характэрнымі асаблівасьцямі організацыі сьвяткаваньня, якіх павінен дабіцца ізбач, зьяўляецца ўдзел у сьвяткаваньні самай шырокай масы і адбітак яго ў быце селяніна, а таксама найбольшае выяўленьне самадзейнасьці, творчасьці з боку масы моладзі. **Масавасьць сьвяткаваньня павінна перавярнуць гадавіну ў магутн. дэмонстрацыю згуртаваньня сялянскіх мас вакол Савецкай улады, гатоўнасьці абараняць яе і ўсе заваёвы рэволюцыі ад усякіх наступленьняў з боку ворага—імпэрыялістычных дзяржаў і рускай белагвардзейшчыны.**

У дні 6 і 7 лістапада.

У гэтым годзе дзень ураджаю будзе прыбліжан да сьвяткаваньня дзён Кастрычнікавай рэволюцыі і ў вёсцы сьвяткавацца амаль у адзін час. Пагэтаму можна раіць наладзіць выстаўку ў нядзелю 30-га кастрычніка. **Адчыненьнем выстаўкі і павінна распачацца ўсё сьвяткаваньне.**

6-га лістапада пападае ў нядзелю. Гэты дзень можа быць ахвяраван шырокім сходам, на якіх выяўляецца значэньне гадавіны і праводзяцца ўсе асноўныя даклады аб 10-цігодзьдзі. Увечары ставіцца спэктакль ці наладжваецца вечар успамінаў.

Раніцою ў панядзелак 7-га лістапада наладжваецца дэмонстрацыя. Для гэтага трэба дагаварыцца, каб у дэмонстрацыі прынялі ўдзел у організаваным парадку сябры організацыі, якія маюцца ў вёсцы. Так, напрыклад, **комсамольская ячэйка, ячэйка партыі, сельсавет са сваімі членамі сэкцыі, члены дабраахвольных таварыстваў і інш., аб'яднаўшыся ў адну агульную групу, складуць ядро дэмонстрацыі к якой павінны прымыкаць усе жадаючыя.**

Калі ў сельсавеце ёсьць **сельска-гаспадарчыя колектывы** (арцелі, комуны), неабходна дабіцца абавязковага іх удзелу ў дэмонстрацыі. Гэты ўдзел павінен быць найбольш паказальным. Пажадана, каб комунары вышлі на дэмонстрацыю ў поўным складзе з сем'ямі і, калі можна, то з такімі сельска-гаспадарчымі машынамі, як **трактары, складаныя малатарні і інш.**

Наогул кажучы, дэмонстрацыю раіцца наладжваць толькі ў тым выпадку, **калі яна будзе добра падрыхтавана, можа стаць масавай, уцягнуць у сябе значную частку неорганізаванага насельніцтва.**

Калі дэмонстрацыі не наладжваюцца, тады дзень 7 лістапада можна праводзіць дваяка. Ці да 12 гадзін організаваць **дзіцячы ранішнік, а з 12 наладзіць урачыстае паседжаньне ўсіх організацый вёскі ў прысутнасьці насельніцтва.**

На гэтым-жа паседжаньні адбываецца адчыненьне і закладка новых будынкаў ці ўстаноў, якое будзе падрыхтавана да Кастрычнікавых дзён. Напрыклад, **закладка будаваньня школы, агра ці вэтпункту, хаты-чытальні, адчыненьне дзіцячага саду, ці наадварот, зачыненьне царквы** (падрыхтаванае пастановамі вёскі), а таксама наладжваньне **акцябрын, чырвоных вясельляў, ушанаваньне гэрояў рэволюцыі, гэрояў працы і інш.**

Увечары наладжваецца спэктакль, радые, кіно, ці вогнішчы, ілюмінацыі і працягваньне гульняў, сямейныя вечары, вечары самадзейнасьці.

Як 7 лістапада, так і ў дзень дзіцячага сьвяткаваньня (8 лістапада) пажадана організаваць для дзяцей **пачастункі і падаркі**, напрыклад, **раздачы кніжак**. Да гэтай справы трэба прыцягнуць копэрацыю, шэфскія організацыі, таварыства «Прыяцельнікі дзяцей» і інш.

А. Шыронаў.





Комсамолка Дуня

Нашу Дуню ўсе кахаюць,
Ручкай да яе махаюць.
Э-эх, Дуня, Дуня, Дуня я,
Комсамолачка мая.

Баб Дуняшачка зьбірае,
Ды газэты ім чытае.
Э-эх, Дуня, Дуня, Дуня я,
Найпрыгожая мая.

— Дзесяць год Савекай улады,
Ой, і якжа мы ўсе рады.
Э-эх, Дуня, Дуня, Дуня я,
Чырвонашчокая мая.

Дождж халодны імжыць
На спэктакль Дуня бяжыць.
Э-эх, Дуня, Дуня, Дуня я,
Комсамолачка мая.

На ўсе рукі масьцярыца,
І артыстка і пявіца.
Э-эх, Дуня, Дуня, Дуня я,
Найпрыгожая мая.

Сватаў Дуню наш кулак,
Гаварыў ён дзеўцы так:
Усіх багачэй, Дуня я,
Дуня—ягадка мая.

Кідай, Дуняша, вучобы,
Яна высечэ усе вантробы.
Эх, Дуня, пэўен я:
Будзеш жонка ты мая.

Ня жыцьцё ў мяне, а рай—
Усё што хочаш выбірай
Эх, Дуня, Дуня, Дуня я,
Усё, што хочаш выбірай.

У палацах будзеш жыць,
Дарагое віно піць.
Э-эх Дуня, Дуня, Дуня я.
Ну скажы, што ты мая!

Разабраў тут Дуню сьмех,
Дзеўка крыкнула пры ўсіх:
Э-эх, Дуня, Дуня, Дуня я,
Брат, ня буду я твая.

Кулаку ня будзе толку,
Калі возьме комсамолку.
Э-эх, Дуня, Дуня, Дуня я,
Не магу быць цёмнай я.

У нашай вёсцы ты кулак,
Комсамол табе ня ў смак.
Эх, Дуня, Дуня, Дуня я,
Комсамол табе ня ў смак.

Прасьпяваю песьню гэту.
Усяму чырвону сьвету.
Э-эх, Дуня, Дуня, Дуня я,
Кулакам няма жыцьця.

Я табе не пападуся,
З комсамольцам запішуся.
Э-эх, Дуня, Дуня, Дуня я,
За комсамольца выйду я.



Гульні з адгадваньнем задуманага.

Дагадлівы матэматык.

Адгадчык прапануе кожнаму з тых, што знаходзіцца ў аўдыторыі, задумаць любы лік і не казаць яго ні яму, ні суседу. Лік павінен быць ня больш тысяч . Прыбаўце да гэтага ліку тысячу, яшчэ прыбаўце сто, аднімеце 200, аднімеце задуманы лік, атрыманы вынік падзялеце на тры, дабаўце 25. Зараз я магу адгадаць, які ў вас атрымаўся адказ—325.

Заўвага: гэта адна з самых прымітыўных арытмэтычных гульняў, аснованая на адніманьні задуманага ліку з выніку. Чым складаней будуць праводзіцца дзеі, тым менш гульцы могуць дагадвацца аб сутнасьці фокусу.

Адгадаць задуманую рэч.

Усе гульцы сядзяць. Яны выбіраюць адгадальніка, які павінен выйсьці з пакою. У яго адсутнічаньні задумваюць якую-небудзь рэч (кніжку, малюнак, стол, сабаку і інш.) Потым завуць адгадальніка, ён падыходзіць да кожнага гульца і задае пытаньні, якія дапамагаюць яму выявіць загаданае, прычым гульцы могуць адказваць толькі **«так»** ці **«не»** і часам яшчэ **«часткова»**. Калі гульцоў ня шмат, чалавек 10, ён задае кожнаму тры пытаньні, калі шмат (20-30), то адно пытаньне. На кім адгадальнік адгадае задуманую рэч, той робіцца адгадальнікам. Калі-ж гульня праводзіцца ў масавай аўдыторыі, то адгадваючы зьвяртаецца з пытаньнямі да ўсяе аўдыторыі, і гульцы адказваюць яму хорам.

Адгадаць задуманы верш.

Усе гульцы сядзяць у коле. У адсутнічаньні адгадчыка выбіраецца які-небудзь усім вядомы (і ў тым ліку адгадчыку) верш і разьмяркоўваецца ў парадку разьмяшчэньня гульцоў па аднаму слову кожнаму. Адгадчык падыходзіць да кожнага ўдзельніка і дае яму любыя тры запытаньні. Адказваючы павінен даць правільны адказ і ўставіць яго бяз зьмены сваё слова з вершу. Мастацтва адказу складаецца ў тым, каб ублытаць у адказ сваё слова так, каб не зрабіць націску на ім, і адгадчык ня мог зьвярнуць на яго ўвагу. Адгадчык па адказам павінен адгадаць задуманы верш; хто першы навёў адгадчыка на правільны шлях, гэта значыць дапамог адгадаць, той становіцца сам адгадчыкам.

Будуйце прагоны.

У рэдкай вёсцы прагоны прыведзены ў парадак. Часта наглядаецца, як у непралазнай гразі дробная жывёла чуць ня топіцца, а каровы зварачаюцца дахаты брудныя, стомленыя і даюць менш малака. Коні з вазамі надрываюцца ад непасільнай работы, часта рвецца збруя, ламаюцца калёсы.

Усё гэта, вядома, дрэнна адбіваецца на гаспадарцы селяніна.

Калі падлічыць усе нявыгоды ад бруднага прагону, адразу стане зразумелым, што трэба, ня трацячы часу справіць прагон.

Спачатку даведайцеся дакладна, ад чаго робіцца загразьненьне прагону. Бывае так, што вада сьцякае ў нізіну з узгоркаў, а з нізіны ёй выбрацца няма куды. Тады трэба абкапаць дарогу глыбокімі канавамі, а зямлю выкідаць на дарогу. Зьверху пакласьці пучкі ламачча, яловых лапак і засыпаць буйным пяском. Яшчэ лепш, вядома, замасьціць каменьнем, калі ёсьць блізка каменьне. Толькі не рабіце так, як звычайна—насьцілаюць на гразь тонкія бярвеньні, ад іх толку мала. Трэба асушыць бакі дарогі і падняць вышэй палатно, тады будзе суха. Бывае так, што вада трымаецца на моцным грунце—гліне ці вапне, як на талерцы з узьнятымі берагамі. Паспрабуйце пракапаць грунт да наступнага пяшчанага пласту. Вада можа па ім сьцячы ў больш нізкае месца і прагон абсохне. Каб студні не заплылі, пакладзеце ў іх каменьне і пясок.

Часам такімі мерамі прагон асушыць ня можна, таму што вадзе няма выхаду. Тады застаецца адно—выкапаць канаву ў самым нізкім месцы і выкачваць з яе ваду насосамі. У Голяндыі для гэтай мэты прыладжваюць ветракі і асушваюць агромністыя прасторы балотаў. У нас таксама гэты спосаб можна ўжыць, як дзяшовы і самы просты.



Між балот, між палёў...

(На мотыў „Хаз булат“).

Між балот, між палёў
Бель-бярозка стаіць.
Ля бярозкі прылёг
Малы хлопчык і сьпіць.

Гэй, сям'я юнакоў,
Сабірайся ў атрад.
— Будзь заўсёды гатоў!—
Наш і кліч і загад.

Ветры веюць, шумяць,
Між далін ля травы.
Хоча хлопчык устаць,
Ды ня ўзьняць галавы.
Гэй, сям'я юнакоў... і г. д.

Пад напевы лістоў
Залаты сьніцца сон:
Бачыць родных бацькоў,
Як і некалі ён.
Гэй, сям'я юнакоў... і г. д.

На каленях прылёг,
Янка ў маткі сваёй...
Казку слухае ён
Аб хацінцы лясной.
Гэй, сям'я юнакоў... і г. д.

Пра цароў і паноў,
Што вайну узьнялі,
І як бацьку яго
У салдаты ўзялі.
Гэй, сям'я юнакоў... і г. д.

Не зьвярнуўся назад
Бацька з гэтай вайны.
Не зьвярнулася й шмат,
А пайшлі ў курганы...
Гэй, сям'я юнакоў... і г. д.

Затрашчаў над імі сук,
Загрымеў дзесьці гром.
Прахапіўся хлапчук,
Бачыць—поле кругом.
Гэй, сям'я юнакоў,
Сабірайся ў атрад.
— Будзь заўсёды гатоў! —
Наш і кліч і загад.

Хата-чытальня ў Кастрычнік.

Падрыхтоўка мастацкай часткі ўрачыстасьці[1]).

Асноўным, больш распаўсюджаным відам мастацкай работы зьяўляецца **драматычная**. З узмацненьнем драматычнай работы трэба пачынаць справу ўзмацненьня ўсяе мастацкае работы. Драмгурток павінен і можа быць асноўнай групай для разгарненьня мастацкай работы наогул. З драмгуртка могуць і павінны вылучыцца асноўныя сілы для ўтварэньня харавога гуртка і аркестру.

У дні вялікай урачыстасьці Кастрычніка кожная хата-чытальня, згуртаваўшы вакол сябе ўсіх комсамольцаў і ўсю лепшую беспартыйную моладзь, павінна даць забавы і веселату ў наступных формах.

П'еса і інсцэніроўка.

Пастаноўка спэктакля—разгульваньне п'есы—у гэтым і выражаецца часьцей за ўсё мастацкая работа. Інсцэніроўка адрозьніваецца ад п'есы толькі тым, што з прычыны адсутнічаньня патрэбнай п'есы ў апошнюю перарабляецца апавяданьне, верш, ці інсцэніроўка складаецца з шэрагу ўрыўкаў мастацкай літаратуры.

У адзнаку ад іншых формаў і відаў мастацтва, п'еса найбольш даступна, зразумела, найбольш блізка і проста падыходзіць да адчуваньняў, думак і волі гледачоў. У кожнай п'есе ідзе тая ці іншая барацьба, тая ці іншая падобная з жыцьцём гледача сутычка, выводзяцца тыя ці іншыя тыпы, фігуры, становішчы—ці знаёмыя, наогул, цікавячыя гледача. Мастацкая, прадумана напісаная п'еса заўсёды дасьць шмат новага, шмат каштоўнага. Аднаму яна ўзбагаціць яго жыцьцёвы вопыт і пакажа тое, чаго ён да гэтага часу ня ведаў, другому пакажа здарэньне, кавалак жыцьця з такога боку і так, як ён аб гэтым і ня думаў.

Для таго, каб прадстаўленьне захапіла гледача, п'еса павінна быць добра падрыхтавана. Нельга пасьля 2-3 рэпэтыцый выходзіць на сцэну. Нельга гуляць, ня ведаючы роляй. Нельга гуляць, не разумеючы ні ролі, ні п'есы.

Пагэтаму пасьля таго, як п'еса прачытана, трэба зрабіць яе магчыма больш зразумелай для гуртоўцаў. Для гэтага неабходна правесьці вакол п'есы гутарку і выявіць, да якога часу яна адносіцца, якія клясы, грамадзкія групы выведзены у п'есе. Асабліва трэба падумаць над тым, што можа даць п'еса насельніцтву, якая яе грамадзкая і мастацкая вартасьць.

Калі ўсё гэта зроблена, трэба брацца за рэпэтыцыі. Першыя рэпэтыцыі лепш праводзіць за сталом, аддаючы ўсю ўвагу рабоце над тэкстам, над словамі п'есы. Потым можна пераходзіць к рэпэтыцыям на сцэне з рухамі.

Канцэрт

Вельмі часта маладыя драмгурткі, а часам і моцныя, калі няма падыходнай п'есы ці ў інтарэсах унясеньня повага ў сваю працу, замест спэктаклю, а то і сумесна з ім, наладжваюць канцэрт. Ён выгадней тым, што падрыхтаваць яго шмат лягчэй, чым п'есу. Удзельнікі могуць рыхтавацца па аднаму ці маленькімі групкамі. У канцэрце можа быць дадзена і невялічкая сцэнка на дзьве-тры дзеючых асобы, але асноўнымі нумарамі канцэрту зьяўляюцца: **дэклямацыя, пеньне, апаваданьне, танец, музычнае выступленьне** .

Хор. Прыпеўкі

Самае галоўнае ў хоры—адказацца звычайнага ў вясковым пеньні, крыку і даваць у песьні плаўны, роўны, зычны голас, пагоджанае, дружнае, выразнае пеньне[1]).

Прыпеўкі пяюцца на сцэне часьцей за ўсё параю—хлапцом і дзяўчынаю. Словы пяюць па чарзе, а гарманіст падыгрывае.

Калі прыпеўкі выконваюцца бойка, выразна, весела — глядач застаецца імі вельмі задаволен.

Увабраньне хаты-чытальні

Нічога лішняга ў аздабленьні хаты-чытальні да Кастрычніку не павінна быць. Галоўныя клапоты мастацкага гуртку, каб у пакоях было усё ясна і зразумела. Можна зрабіць патрэбныя рамкі, вянкі, занавескі, выразаныя з чырвонай паперы зоркі і інш.

Калі ёсьць які-небудзь куточак, кніжная полка, выставачка—усё гэта павінна мець ясныя, выразныя, чоткія надпісы.

Трэба ўважліва сачыць за тым, каб не „аздаблялі“ хату-чытальню пыльнымі, паабдзіранымі,назалеташнімі плякатамі. Такая «аздоба» наносіць сум.

Л. Субоцін.

[1]) Глядзі кнігу Л. Субоцін „Художественная работа избы-читальні“.

[1]) Песьні і прыпеўкі для хору можна узяць у зборніку „Комсамольскія вячоркі“ які толькі што вышаў у БВД.



Як павінен выглядаць хата-чытальня ў дзень Кастрычніка.

Саюзныя навіны.

Курсы павадыроў фарпостаў. Гэтымі двямі скончылі сваю працу менск'я акруговыя курсы павадыроў фарпостаў.

Заслухаўшы справаздачу аб рабоце курсаў, бюро Менакругкому ЛКСМБ адзначыла, што яна ішла правільна і курсы сябе цалкам апраўдалі. Неабходна замацаваць на рабоце ў якасьці павадыроў фарпостаў усіх таварышоў, скончыўшых курсы.

Побач з гэтым, у бліжэйшы час па Менску будуць склікаваны раённыя нарады павадыроў фарпостаў, якія не наведвалі курсы, з наступнай абвесткай дню: 1) чарговая праца школ; 2) аб самаарганізацыі вучняў і 3) падрыхтоўка да Кастрычнікавых сьвят.

Што дала лягерная кампанія. Менакругком ЛКСМБ заслухаў справаздачу акрбюро ЮП аб правядзеньні і выніках лягернай кампаніі ў Менскай акрузе.

Дасягненьнямі кампаніі зьяўляюцца: выхад у лягер 25 процантаў колькасьці ўсіх атрадаў, добры падбор мясцовасьцяў і памяшканьняў для лягераў, зацікаўленасьць і дапамога партыйных і камсамольскіх арганізацый, добрыя вынікі аздаравіцельнай работы і разгортваньня грамадзкай дзейнасьці ў лягерах.

Да недахопаў адносяцца: адсутнасьць у лягерах мэдыцынскіх сіл і нагляду, малая забясьпечанасьць некаторых атрадаў сродкамі і недастатковае знаёмства часткі павадыроў з лягернай работай.

Новая швэйная фабрыка.

Меншвэй вызначыў пабудаваць у Менску новую швэйную фабрыку. Вядуцца перамовы з Камхозам аб прадстаўленьні адпаведнага вучастку зямлі.

На работы па пабудове фабрыкі будзе асыгнавана 180 тысяч рублёў.

Месцы у рабфак і унівэрсытэт

Прэзыдыум ЦСПСБ атрымаў 40 мясцоў у вячэрні рабфак і 25 у вячэрні рабочы ўнівэрсытэт.

Усе гэтыя месцы разьмеркаваны пропорцыянальна ліку саюзнай масы па ЦП саюзах, куды і трэба зьвярнуцца за камандыроўкамі рабочым і служачым, жадаючым паступіць вучыцца.

Цэнтральны „Дом Селяніна“.

У Менску заканчваецца пабудова цэнтральнага „Дому Селяніну“, на якой занята 155 чалавек.

Ужо гатовы 3 паверхі. Надворнае будаўніцтва „Д. С“. мяркуецца закончыць да 10-ці годзьдзя Кастрычніка, пасьля чаго пачнецца ўнатраная аддзелка пакояў.

Пабудова дому будзе каштаваць 500 тысяч рублёў.

Профсаюзная бібліотэчка

ЦСПСБ прыступае да выданьня спэцыяльнай профсаюзнай бібліотэчкі на мовах ўсіх нацыянальнасьцяў БССР.

У першую чаргу будуць выданы брашуры аб выніках 7-га ўсесаюзнага зьезду профсаюзаў (стэнаграмы дакладаў т. т. Томскага, Мельнічанскага, Андрэева і г. д.).

НАВУКА І ЖЫЦЬЦЕ.



(**Лекцыя інж. Фёдарава „Палёт на месяц“**).

Хто з нас не задаваў сабе пытаньня: а што робіцца на тых нябесных целах, кожнае з якіх, апрача Месяца, Вэнэры і Марса, перавышае па разьмерах зямлю ў сотні і тысячы разоў?

Мабыць, багата чароўных тайн, поўных глыбейшай цікавасьці, хаваюць у сабе ўсе гэтыя сьветлыя плямачкі, велічыня якіх здаецца нам ня больш галоўкі цьвіка.

У многіх яшчэ існуе погляд, быццам астраномія і, у прыватнасьці, тая галіна яе, якая займаецца вывучэньнем міжпланетных падарожжаў, зьяўляецца навукай акадэмічнай, далёкай ад жыцьця, ня маючай ніякага практычнага значэньня.

Даказаць адваротнае гэтаму ўзяўся загадчык сэкцыі міжпланетных зносін Усесаюзнага таварыства астраномаў інжынэр **Фёдараў**, які прыехаў у Менск прачытаць лекцыю пра палёт з зямлі на месяц.

Поўная заля клюбу імя Карла Маркса сьведчыла аб зацікаўленасьці грамадзкай думкі тэмай лекцыі і злабадзённасьці апошняй. Зьявіліся профэсары БДУ, настаўнікі, студэнты, рабочыя. У чаканьні лектара гутараць і спрачаюцца.

— Усё гэта неажыцьцявімыя байкі,— чуецца моцны бас якогасьці скептыка— прачыталі ў афішах «Палёт на мэсяц», дык ужо рот разьзявілі і паверылі. Пачакайце, адна справа пісаць і гаварыць пра палёт, а другая—непасрэдна ляцець.

— Выбачай,—заспрачаўся яго таварыш з студэнтаў,—хіба ты ня ведаеш, што палёт на месяц тэарэтычна ажыцьцявім? Вопыты і дасьледваньні вядомых вучоных кажуць нам...

Тры сыгналы, якія азначаюць пачатак лекцыі, кладуць канец «дыскусыям» па ўсім куткам залі.

Замест строга навуковага, акадэмічнага выкладаньня лекцыі, мы пачулі простыя і блізкія словы, зразумелыя тлумачэньні:

— «Неабходна дапамагчы шырокім масам шляхам адпаведных лекцый, дакладаў, выставак і літаратуры ўсьвядоміць ідэю міжпланетных зносін. Справа ў тым, што пры сучасным тэхнічным прогрэсе мы знаходзімся напярэдадні ажыцьцяўленьня такой грандыёзнай „баячнай фантазіі“, як палёт з зямлі на месяц.

Ідэя міжпланетных зносін такая-ж старая, як і само чалавецтва. Захаваўся яшчэ старасьвецкі міф аб і кары, які, прыляпіўшы да сябе крыльлі, зрабіў спробу палёту на сонца і загінуў, сарваўшыся на зямлю.

У апошнія часы выдатныя вучоныя, у тым ліку і нашы расійскія (Цыалкоўскі, Цандэр і інш.) заняліся ажыцьцяўленьнем гэтай ідэі і дасягнулі некаторых вынікаў. Іх работы ідуць галоўным чынам па лініі вынаходжаньня такога апарату, на якім можна было-б прадпрыняць палёт да бліжэйшага да нас нябеснага цела —месяцу.

«Ракета» Цыалкоўскага зьяўляецца найбольш падыходзячай. Яна пабудавана такім чынам, што чалавек, пры ўзьлеце на яе з хуткасьцю **11 кілёмэтраў у сэкунду**, зможа бесперашкодна перанесьці гэтую хуткасьць, дыхаць, карміцца за ўвесь час падарожжа і адначасова кіраваць ракетай па любому кірунку.

Міжпланетны карабель па прынцыпу проф. Цыалкоўскага ўжо будуецца і хутка будзе гатовы, пасьля чаго на ім будуць зроблены пробныя палёты.

Пасьля гэтых палетаў у верхніх пластох нашай атмасфэры і вышэй яе мы зьбіраемся наведаць месяц і дакладна з ім азнаёміцца.

Тав. Фёдараў падрабязна разьвіў перад аўдыторыяй ідэю сваёй ракеты, яе тэхнічныя прыстасаваньні, нарэшце абмаляваў прыкладны шлях ад зямлі да месяца.

Ня гледзячы на тое, што на месяцу няма паветры, прабываньне на ім не зьвязана для міжпланетных вандраўнікоў з небясьпекай для жыцьця. Яны адзенуць адпаведныя касьцюмы-скафандры, прыстасаваныя да «месячных умоў», з запасам кіслароду для дыханьня.

«Па меркаваньнях вучоных, глеба месяцу багата рознымі рэдкімі залежамі, — золатам, плятынай і інш. каштоўнымі мэталамі, што надае ажыцьцяўленьню ідэі міжпланетных зносін, апрача навуковага, яшчэ і вялікае экономічнае значэньне.

У выпадку пасьпяховага наведваньня месяцу і благапалучнага звароту з яго, уявеце сабе, якія багатыя пэрспэктывы па заваёўваньню неба вырысоўваюцца перад чалавецтвам. Магчыма, што з цягам часу ня мы, дык будучае пакаленьне будуць бесьперашкодна зносіцца з бліжэйшымі планетамі, як цяпер, скажам, Масква з Ленінградам.

*
* *

Малады, але поўны запалу і энэргіі астраном-лётнік тав. Федараў цьвёрда рашыў ажыцьцявіць ідэю палёту на месяц да канца і ўпэўнены ў посьпеху свайго прадпрыемства.

Гэта не намер шалёнага фантазёра, ідучага на поўную згубу, а дасканала абдуманы плян, абаснаваны з навуковага пункту погляду.


Я. Зэльцар.

„Золата савецкіх палёў“.

Колькі займаў штогодны хлебны экспорт.

Наш хлеб, гэта--нашыя грошы. Грошы, якія нараждаюцца з году ў год і на якія заграніца дае машыны і варштаты, матэрыю, лекі, каштоўныя хімічныя прэпараты. З асаблівай увагай, з выключнай клапатлівасьцю павінны мы несьціць гэта „золата нашых палёў“, якое дае магчымасьць разьвіваць і пашыраць нашу народную гаспадарку.

Багаты наш саюз гэтым золатам. Уявеце сабе, што па ўсёй чыгуначнай лініі Архангельск—Севастопаль (а гэта раўняецца 2500 вёрст) стаяць на трох калях тры непарыўныя ланцугі таварных вагонаў, якія нагружаны зьверху да нізу жытам. І вы трымаеце прыблізнае разуменьне аб тым, што гэта тыя 750 мільёнаў пудоў зярня, якія ў ураджайныя гады старая Расія выкідвала на сусьветны рынак.



Упяршыню пасьля рэволюцыі савецкі хлеб пачаў атаку на сусьветны рынак у 1922 годзе.

І ўжо гэтая першая атака прымусіла адступіць нашых конкурэнтаў: Канаду, Аргэнтыну і Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты. Хлебныя цэны адразу ўпалі на 10-15 процантаў і пасяўныя плошчы зернавых хлябоў рэзка скараціліся. А далей—новыя атакі савецкага хлеба і новае адступленьне конкурэнтаў.

У галіне хлебнага экспорту мы не дасяглі яшчэ даваеннага ўзроўню. Але мы з кожным днём ідзём усё далей і далей і няма сумненьняў у тым, што ў бліжэйшай будучыні савецкі хлеб зноў будзе складаць асноўную масу на сусьветным рынку.

Мы не закрываем вочы на цяжкасьці, якія стаяць на нашым шляху. Мала сабраць гэтыя сотні мільёнаў пудоў. Трэба яшчэ даставіць іх да нашых партоў, захаваць там да пары, выгодна прадаць за мяжу. Трэба ня толькі паклапаціцца аб тым, каб з году ў год узрастаў наш хлебны экспорт. Трэба прыняць яшчэ ўсе меры да таго, каб і па якасьці наш хлеб быў-бы добры, каб заграніца плаціла за яго добрыя грошы. А якасьць савецкага хлеба покуль нізкая.

Тут ёсьць шмат прычын, якія выцякаюць з агульнай пастаноўкі сельскай гаспадаркі ў нашым Саюзе. Гэтыя прычыны зьнішчаюцца ў ходзе тэхнічага прогрэсу.

Але ёсьць яшчэ 2 прычыны, якія цяжка адбіваюцца на нашым хлебным рынку. Гэта—слабая транспартная сетка і адсутнасьць складачных месц.

Мільёны пудоў нашага хлеба ляжалі ў партах пад адкрытым небам і безнадзейнага гнілі, а замежныя купцы не сьпяшаліся пакупаць, даючы выключна нізкія цэны. Яны вельмі добра разумелі, што воляй-няволяй нам прыдзецца пайсьці на любыя ўмовы, толькі-б прадаць наша зярно, якое можа ў бліжэйшы час зусім папсавацца. У нас было мала транспартных шляхоў, якія маглі-б у любы момант і ў любой колькасьці перакінуць зярно да нашых партоў, і ня было складачных памяшканьняў—элеватараў, дзе зярно магло-б адляжацца належны час.

Што-ж робіць Саюз у гэтай галіне?

У сучасны момант узмацненым тэмпам накідваецца грандыезны проэкт вялікай транспартнай магістралі „Волга—Дон—Азоўскае мора“. Гэты шлях дасьць шагчымасьць з вялічэзнай плошчы Паволжай ў 1 мільён квадратных кілёмэтраў дзешава і без перагрузак перавазіць хлеб да растоўскага порту на Азоўскім моры, каб адтуль перакідваць яго непасрэдна на сусьветны рынак.

Па самым сьціплым падлікам у першыя-ж гады пасьля пабудовы праз **Волга-Донскі канал пройдзе штогодна каля 150 мільёнаў пудоў савецкага хлеба, які на кожным пудзе з'экономяць 11 кап.** І вось гэтыя скінутыя 11 кап. дадуць савецкаму хлебу лішні козыр пабіць сваіх конкурэнтаў.

А затым—сетка элеватараў, якая ўжо будуецца і якая густа пакрое нашы чыгуначныя шляхі і парты.

Усё гэта дае падставу сьмела глядзець у будучыню. „Золата савецкіх палёў“, узмацнёнае сеткай элеватараў і такой хлебнай магістральлю, як Волга-Дон, прымусіць заграніцу прызнаць усю непарушную моц вялікай савецкай гаспадаркі.



„Сарачынскі кірмаш“

(Кіно „Культура“).

Аповесьць М. В. Гогаля „Сорочинская ярмарка“ атрымала адбіцьцё на экране ў вытворчасьці ВУФКУ. Атрымала адбіцьцё без малейшых зьменаў, захаваўшы ўсе гогалеўскія малюнкі Украіны, надпісы, гумарыстычныя моманты. Рэжысэр строга прытрымліваўся аповесьці, ня згубіў жанру Гогаля,—толькі гэтым і можна растлумачыць добрую якасьць фільму.

Вартасьць „Сарачынскага кірмашу“— у тым, што ён нам паказвае быт украінцаў, яскрава абмалёўвае тагочасны украінскі кірмаш, асаблівасьці якога захаваліся і да гэтай пары.

Кадры, прысьвечаныя гэтаму, сьвежыя і яскрава-рэалістычныя.

Адно, што можна прызнаць няўдалым у фільму — гэта месца, дзе паказваецца пекла. Пекла жадалі паказаць, як пародыю на сучаснасьць, а гэта і не ўдалася. Вышла расьцягнута і незразумела.

У агульным-жа добрае ўражаньне. Гэта дзякуючы глыбокай гульні артыстых віртуознай працы опэратара (зьяднаньне шмат якіх момантаў у адзін кадр і інш.) і цікаваму пабудаваньню ўсяго фільму.

Т.

*
* *

Фільм, пастаўлены рэжысэрам Грычэр-Чарыкаверам, паказвае забабоны сялян, страх папасьці ў пекла, страх перад чырвонай сьвіткай.

Асаблівы цікавы ў фільму моманты кірмашу. Яны вельмі добра падаюцца опэратарам.

І яшчэ што трэба адзначыць — гэта тое, што рэжысэр добра зразумеў тыя тыпы, якія ёсьць у аповесьці Гогаля. Такімі, як глядач іх прадстаўляў па аповесьці ён і ўбачыў на экране.

Трэба адзначыць гульню артыстага Мініна (чорт) і Токарскай (дачка).

Я. Гарбацэвіч.
(Белпэдтэхнікум)

*
* *

Перанясеньне твораў клясыкаў на экран трэба толькі вітаць. Адзін з першых вопытаў у гэтай галіне пастаноўка „Сарачынскі кірмаш“ сабе апраўдала.

Зьмест гэтай аповесьці ўсім вядомы На фону каханьня маладой сялянскай парачкі разгортваецца перад гледачом малюнак кірмашу, быт украінскіх сялян, іх забабоны.

Усё гэта таленавіта пададзена рэжысэрам. Наогул, „Сарачынскі кірмаш“ вельмі добра пададзены. Пастаноўшчыкі фільму добра зразумелі Гогаля.

В. Палякоў
(Аб'яднаная профшкола).

„Кумір публікі“.

(Кіно „Спартак“).

Адкапваць сярод рознай кіно-завалі самыя дрэнныя фільмы—гэта якбы адзіная работа кіно **„Спартак“**.

Зараз дэмонструецца **Кумір публікі“**.

Заве ца гэта камэдыяй. Гэрой (у выкананьні **Бэна Цюрпіна**) б'е пасуду, апракідвае розныя рэчы, перашкаджае людзям у працы— гэта па думцы рэжысэраў, павінна выклікаць сьмех.

Бэн Цюрпін яшчэ грымасьнічае, косіць вочы, ламае рукі. Больш нічога „комэдыйнага“, у яго гульні ня знойдзеце.

Сапраўды сьмешна!

Толькі ня з гэтага „куміру“.

А—кі.

Навіны тэатру і кіно.

Яўрэйскі тэатр у Магілеве.

Яўрэйскі Дзяржаўны Беларускі Тэатр гэтымі днямі выехаў у Магілеў.

Тэатральны сэзон ён распачне 1-га кастрычніка п'есамі **„На ланцугу пакуты“** і **„Сьвята ў Касрылаўцы“**.

Ігар Ільлінскі ў Менску.

У пачатку кастрычніка ў Менск прыяжджаюць артысты тэатру Мэерхольда і кіно-колектыву „Межрабпом-Руэь“—вядомы комік Ігар Ільлінскі і пісьменьнік Зошчанка.

Ігар Ільлінскі дасьць дзьве гастролі, у програму якіх увойдуць: сцэнкі з пастановак тэатру імя Мэерхольду, перадача гумарыстычных апавяданьняў Зошчанкі, Зазулі і Веры Інбэр. Акрамя гэтага, Ігар Ільлінскі дасьць уласнае камічнае апавяданьне—„Як я стаў кіно-артыстым“.

Посьпех фільму „Поэта і цар“.

Білеты на фільм „Поэта і цар“ шпарка раскупаюцца менскім насельніцтвам. Ня гледзячы на тое, што папярэдні продаж білетаў пачаўся ў чацьвер, прадана ўжо ля 800 білетаў.

Куды пайсьці.

Сёньня і ў панядзелак у клюбе **Карла Маркса** адбудуцца 2 гастролі вядомага чытача на расійскай і яўрэйскай мове Я. Бомаса.

Заўтра ў тым-жа клюбе гастроль 13-гадовага скрыпача **Адольфа Ляшчынскага**. У рэпэртуары: Мэндэльсон, Крэйсьлер. Карэльлі, Эрдэнка і інш.

Папраўка.

У апошнім нумары ў нататцы „Яўрэйская опэра ў Менску“ памылкова надрукавана, што опэра дасьць гастролі 23 і 24 верасьня. Гастролі будуць даны 3 і 4 кастрычніка.

Кастрычнік ідзе.

Саўхозы, лячэбніцы, агранамічныя пункты.

Наркамзем да 10-й гадавіны Кастрычніка прыстасоўвае адчыненьне ў розных акругах БССР 7-мі новых саўхозаў, 10 вэтэрынарных лячэбніц і 5-ці агранамічных пунктаў.

Акрамя таго, у адзнаку 10-й гадавіны Кастрычніка паміж сялянамі БССР будзе разьмяркавана на 700 тысяч рублёў лесу.

Кватэры для рабочых

Менская жыльлёва-кватэрная коопэрацыя прыстасоўвае да Кастрычніка скончэньне ўсіх пабудоў і рамонтаў.

Усяго будзе адрамантавана і пабудована 40 дамоў, з 87 кватэрамі для рабочых.

Організуюцца новыя Жакты і электрыфіцыруюцца рабочыя пасёлкі.

„Кастрычнік на Беларусі“.

Выходзіць з друку зборнік успамінаў і гістарычных дакумантаў пад рэдакцыяй С. Агурскага—**„Кастрычнік на Беларусі“**.

Зборнік выдаецца на беларускай, расійскай і яўрэйскай мовах.

Усебеларуская малочная выстаўка.

Белсельсаюз адчыняе ў дзень 10-й гадавіны Кастрычніка ўсебеларускую малочную выстаўку і новы малочны завод у Койданаве, які будзе вырабляць сыр, масла і інш. прадукты. У кожнай акрузе будзе організована па адной малочнай арцелі і некалькі машынных таварыстаў.

Адначасовай наладжваецца конкурс з прэміямі на лепшы сельска-гаспадарчы колектыў.

Перамога электралямпы.

Электрычная лямпа хутка заваёўвае ўвесь сьвет. Яшчэ жыве адзін з вынаходцаў яе—Томас Эдысон, а спажываньне яго вынаходзтва налічваецца ўжо сотнямі мільёнаў пудоў у год. У Англіі, напрыклад, за год ужываецца 20 мільёнаў электрычных лямп, у Нямеччыне 50 мільёнаў, а ў Амэрыцы лік гэты даходзіць да 205 мільёнаў, даючы, такім чынам, у сярэднім па 2 лямпачкі ў год на аднаго жыхара.

Побач з павялічэньнем ліку лямп, расьце і разнастайнасьць іх.



Самая маленькая лямпачка мае сілу сьвятла ў адну чвэрць сьвячы, можа быць устаўлена ў звычайны аловак і ўжываецца дактарамі для опэрацыі ў поласьці рта. Самая вялікая ўладае сілай сьвету ў 100.000 сьвечак, мае ў дыямэтры 12 дзюймаў і ўжываецца пры кіно-здымках. Ток, неабходны для такіх трох лямп, дастатковы для руху трамвайнага вагону.

У тры радкі.

○ У бягучым навучальным годзе па менскай акрузе будуць працаваць 400 **лікпунктаў**.

○ Галоўпалітасьветы разаслаў па ўсім нардамам і хатам-чытальням **комплекты літаратуры да Кастрычніка**.

○ Дзяржплян намеціў пабудаваць у Воршы **ўсебеларускі мясны камбінат**.

○ **Будуюцца новыя вэтэрынарныя лячэбніцы** ў Менскай, Бабруйскай і Гомельскай акругах.

○ У гэтым годзе Меакрана ўводзіць па ўсіх школах Менску **гарачыя сьнеданьні**.

○ МЦРК адпусьціў **4000 рублёў на організацыю профшколы повароў і афіцыянтак**.

На хвалі 500 мэтраў.

(Менская радыё-станцыя імя Саўнаркому БССР).

Сёньня Менская радыё-станцыя перадае наступную програму: 7 г. 00 хв.—радыё-газэта **„Чырвоная Зьмена“**; 7 г. 30 хв.—**Беларуская радыё-газэта № 163** (з яўрэйскім аддзелам); 8 г. 15 хв.—Гутарка ТСА-Авіяхіму на тэму **„вайсковая тэхніка сёньня і заўтра“**; 8 г. 45 хв.—**Інформацыйная справаздача Наркампрацы**; 9 г. 15 хв.—Гутарка ЦК ЛКСМБ на тэму: **„Становішча кваліфікацыі і асьветы рабоча-сялянскай моладзі ў БССР“** і 9 г. 45 хв.—**Концэрт.**

Заўтра перадаецца: 6 г. 00 хв.—радыё-газэта **„Бязбожнік“**; 6 г. 30 хв.—**„Беларуская газэта“** па радыё (з польскім аддзелам); 7 г. 15 хв.—**„Беларускі Піонэр“ па радыё**; 7 г. 45 хв.—**Навіны радыё па радыё**; 8 г. 35 хв.—**Радыё-бюлецень № 4**; 9 г. 05 хв.—**Концэрт.**

У панядзелак будзе перадана: 7 г. 00 хв. —**Гутарка па радыё-тэхніцы**; 7 г. 30 хв.— **Беларуская радыё-газэта № 164**; 8 г. 15 хв. —**Гутарка Наркамзему на тэму „Мэліорацыя зямлі ў БССР“**; 8 г. 45 хв.—**Концэрт.**

Адказы чытачам

Капацевічу (№ 1080) Пры Музтэхнікуме адчыняецца аддзяленьне народнай музыкі. Прыем заяў да 25-га верасьня.

Едавіцкаму (№ 1081) Менскую радыё-станцыю можна чуць у Полацку дэтэктарным прыёмнікамі тыпу „Пролетары“.

Гужыкаву (№1082) Новы кодэкс аб шлюбу яшчэ не зацьверджаны сэсіяй ЦВК СССР.

Адказныя рэдактары { **А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.**

Галоўлітбел № 24867 Менск, 2 друкарня БДВ.